4. Казакова, І.В. Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў / І.В.Казакова. – Мн. : Універсітэцкае, 1995. – 150 с.

5. Калачова, І.І. Народныя традыцыі і звычаі выхавання: этнапедагагічная спадчына этнасаў Беларусі / І.І.Калачова. – Мн. : Беларусь, 1999. – 179 с.

**Илларионова В.С.,** студент 314 гр.

Научный руководитель – Котович О.В.

## ТРАДЫЦЫІ АБХОДАЎ У КАЛЯНДАРНЫХ ПРАКТЫКАХ БЕЛАРУСАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У кожнага народа спрадвекувёўся свой каляндар, у якім з пакалення ў пакаленнеперадавалісямудрасць, веды, вопытжыццевыхназіранняў. Мелітакікаляндар і беларусы. Багацейшыдухоўны свет нашыхпродкаў, іхнадзвычайныталент, яскраваяфантазія, гумарадбіліся ў абрадах і звычаях, гульнях і песнях, прыкметах і павер‘ях.Асобныядні года і наватцэлыяперыядыўстрымалісяселянінам, як сваеасаблівыпаказчык для прыняццятыхціншых мер у гаспадарчых справах. У пераважнай большасці каляндарных абрадаў беларускага народа абавязковым складнікам былі калектыўныя абходы вёскі. Самай галоўнай ідэяй развіцця абрадавых падзей было злучыць ў адзінае цэлае, якое потым будзе прадуктыўна развівацца. Не сталі выключэнне такія абрады як «Каляды», «Масленіца»,»Тройца». У дадзеным выпадку мы маем справу не толькі з тыпалагічна-блізкімі рытуальнымі дзеяннямі, але і з генетычна-тоеснай ідэяй багоў, якія адказвалі за стан прыроды і становішча ў абшчыне, адно за адным «праходзілі» па вясковай вуліцы, асвячаючы кожны падворак і ўсіх яго дамачадцаў.

7 студзеня святкавалі Каляды. Святочвыя застоллі праходзілі як у кругу сям'і, так і з запрашэннем у госці іншых сваякоў. Пасля доўгага перадкаляднага посту скаромная ежа на святочным стале і гарэлка ў пэўнай ступені падкрэслівалі ўрачыстасць застолля і яго значнасць. З гэтага ж дня, вечарам, пачыналі хадзіць калядоўшчыкі з абрадамі слаўлення і добрых зычэнняў гаспадарам і членам іх сямей. З незапамятных часоў хаджэнням калядоўшчыкаў і абыходам імі гаспадарчых падвор'яў у народзе надаецца магічны сэнс. Праз падобныя рытуалы, як лічылі нашы продкі, можна заручыцца падтрымкай Багоў на ўвесь будучы год. Калядоўшчыкі як бы выконвалі функцыянальную ролю пасрэднікаў паміж Богам і чалавекам. Услаўляючы таго ці іншана гаспадара, яны зычылі яму багацце, здароўе і дабрабыт.

Усякі гаспадар імкнуўся шчодра надзяліць спевакоў за такія песні-зычэнні. Магчыма, што ў язычніцкія часы падарункі, якімі надзялялі гаспадары калядоўшчыкаў, у першую чаргу адрасаваліся вярхоўным і родавым боствам і Добрым Духам, і частку такіх ахвярапрынашэнняў тыя адносілі да месца пакланення Сварогу, Дажджбогу, Перуну, Вялесу, Роду і іншым язычніцкім Багам.

Паўсямесна калядрўшчыкі вадзілі з сабою «казу». Лічылася, што з дапамогай гэтай жывёлы можна выгнаць са двара «нячысцікаў», а таксама разлічваць у наступным годзе на добры прыплод жывёлы ў гаспадарцы і плённы здабытак ураджаю з сялянскай нівы, бо, як спяваецца ў песнях калядоўшчыкаў, «дзе каза ходзіць — там жыта родзіць, дзе каза хвастом — там жыта кустом, дзе каза нагой — там жыта капой, а дзе каза топ-топ — там жыта сем коп».

Калі разглядаць абыходы ў кантэксце масленіцы, то на маслянічны тыдзень Жанчыны рабілі абход вескі і вешалі хлопцам-пераросткам калодку драўляную, за тое што тыя не хацелі ажаніцца, а хлопцы ў сваю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чаргу рознымі пачастункамі і блінамі стараліся адкупіцца ад гэтай калодкі. Гэтак жа на масленіцу абыходзілі вёску і дзеці. У самы першы дзень масленіцы дзеці хадзілі па хатах, віншавалі людзей з надыходам Масленіцы і выпрошвалі бліны ў гаспадарамі. Варта адзначыць, што ў некаторых вёсках абход вёскі ладзілі і прадстаўніцы шматдзетных сямей - Жанчыны. Па вёсцы яны вазілі «маладзіц» – дзяўчат, якія выйшлі замуж у апошні Мясаед, у сваю чаргу іх мужы частавалі ўсіх блінамі і прысмакамі.

Калі разглядаць Тройцу і траецкі абрад «Куст»(ваджэнне куста), то там таксама былі абходы вёскі, праводзіліся яны наступным чынам: у першыя дні Троіцы, збіраўся гурт вясковых дзяўчат, дзяўчыны выбіралі самую прыгожую з моладзі перашлюбнага ўзросту, потым ішлі ў лес і выконвалі рытуальнае пераапрананне дзяўчыны. З яе здымалі ўсё адзенне і ўпрыгожвалі ў вянкі з зелянiны раслін. Гэтую дзяўчыну-куст вялі ў вёску і з ўдзелам гурта дзяўчат-пагодкаў выконвалі абход вёскі. Гурт распачынаў абход з канца вуліцы, падыходзілі да аднага з двароў і пачыналі спяваць «куставую» песню, у якой гучалі зварот да гаспадароў, з просьбай падарыць што-небудзь дзяўчыне-кусту. Аднак у «куставых» песнях, якія суправаджалі абход вёскі, гучаць матывы, семантыку якіх можна зразумець толькі ў кантэксце пахавальна-памінальнай абраднасці, а таксама і ўшанаванне продкаў. Гаспадары двара сустракалі гурт перад парогам хаты. Перад парогам мог стаяць стол, або гаспадары трымалі у руках на ручніку парадункі-ахвяраванні: яйкі, хлеб, грошы. Адна з удзельніц абходу прымала гэтыя падарукі і складывала іх у торбу. Гурт дзякаваў гаспападарам іяны ішлі далей да іншых двароў. Пасля таго як абход вёскі быў завершаны, удзельнікі гуртаішлі ў лес да таго месца, дзе пераапраналі «куст» і «разбіралі» яго назад. Пасля рабілі вячэру ў адной з вялікіх хат, дзе гулялі ў гульні, спявалі песні, дарылі падарункі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Золотые правила народной культуры / Оксана Котович, Янка Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2007. – 223 с.

2. Летнія святы : у 1 кн. Кн. 1 / АксанаКатовіч, Янка Крук. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – 291-293с. – Беларускі народны каляндар.

3. Зімовыя святы /АксанаКатовіч, Янка Крук. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2004. – 42с.

**Казачкова В.А., Нікіфарава В.В.** студ. 212 гр.
Навуковы кіраўнік – Байко А.П.

## ФАРМІРАВАННЕ ЦІКАВАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ДА МАСТАЦТВА Ў ПРАЦЭСЕ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Ва ўмовах павелічэння навукаёмістасці вучэбных праграм у малодшай школе і памяншэння колькасці мастацкаарыентаванага кампанента ў складзе уроках ўскладняецца працэс фарміравання цікавасці малодшых школьнікаў да мастацтва. Разам з тым, згодна з «Інструктыўна-метадычным пісьмом «Дадатковая адукацыя дзяцей і моладзі ў 2016/2017 навучальным годзе: актуальныя змястоўныя і арганізацыйныя аспекты», задача ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў 2016/2017 навучальным годзе – працягваць работу па стварэнні рэгіянальных мадэляў выхаваўчай работы ў суботні дзень, дзе ўстановы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі выступяць каардынатарамі арганізацыі шостага школьнага дня. Педагагічным калектывам устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі неабходна арыентавацца на правядзенне сумесных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ